Голас Радзімы

№ 11 (1426)
8 сакавіка 1976 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Цана 2 кап.
Год выдання 21-шы

ФОРМУЛА ПЯЦІГОДКІ — ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ І ЯКАСЦЬ

[«Эканоміка вялікіх маштабаў»] стар. 2

МІРАЖЫ «САЛОДКАГА ЖЫЦЦЯ» РАЗВЕЯЛА РЭАЛЬНАСЦЬ

[«Родина одна...»] стар. 4

БЕЛАРУСЫ УНЕСЛІ ЗНАЧНЫ УКЛАД У РАЗВІЦЦЕ АЙЧЫННАЙ І ЗАРУБЕЖНАЙ ГЕАГРАФІІ

[«Геаграфічныя даследаванні беларускіх вучоных»] стар. 6

ЗНОЙДЗЕНЫ ЯШЧЭ АДЗІН ВЕРШ ФРАНЦІШКА БАГУШЭВІЧА

[«З памяці народнай»] стар. 7



Гэты здымак зроблены ў майстэрні Аляксандра ЗІМЕНКІ—заканчваецца работа над скульптурамі для інтэрната ветэранаў вайны і працы. Пра маладога беларускага майстра чытайце нататкі «Сонейка з гліны» на 8 стар.

САЦЫЯЛЬНАЕ СТАНОВІШЧА—СТУДЭНТ

ІНТЭРВ'Ю КАРЭСПАНДЭНТУ «ГОЛАСУ РАДЗІМЫ» ВАЛЯНЦІНЕ ТРЫГУБОВІЧ ДАЕ НАМЕСНІК МІНІСТРА ВЫШЭЙШАЙ І СЯРЭДНЯЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ БССР ФЁДАР КАПУЦКІ.

— Фёдар Мікалаевіч, заходнія газеты ўсё часцей вымушаны змяшчаць прызнанні накшталт гэтага: «Амаль палавіна маладых настаўнікаў, якія да 1 лютага заканчваюць навучанне ў Гамбургу, не змогуць атрымаць работу. Як аб'явілі гарадскія ўлады, з 550 маладых выкладчыкаў у школы горада будуць прыняты ўсяго 320 чалавек». Перспектыва беспрацоўя стала для студэнтаў заходніх краін праблемай нумар адзін. А што найбольш турбуе савецкіх студэнтаў?

— Пачну свой адказ крыху «з боку». Беспрацоўе для нашых выпускнікоў — паняцце, вядомае толькі з падручнікаў па гісторыі ды артыкулаў пра сучасны Захад. Матэрыяльны бок — таксама не выключна асабістая справа. Дзяржава плаціць стыпендыі, прадастаўляе інтэрнаты, адкрывае бясплатныя бібліятэкі і чытальні. Пачынаецца ўвядзенне льготнага харчавання. Напрыклад, у Беларускім інстытуце інжынераў чыгуначнага транспарту ўсе першакурснікі атрымліваюць штодзённа абеды за палавінную цану, рэшту даплачвае са сваіх фондаў інстытут. Улічваючы ўсё сказанае, самай хвалюючай студэнтаў праблемай можна назваць дакладны выбар будучай спецыяльнасці. У грамадстве, якое ставіць галоўнай мэтай выхаванне гарманічна развітай асобы, важна, каб кожны займаўся менавіта сваёй справай, якую выбраў па прызванню, у якой можа дасягнуць найбольшых поспехаў. І такі просты потым шлях да мэты — гады напружанай вучобы, фарміра-

(Заканчэнне на 4—5-й стар.)

ЭКАНОМІКА ВЯЛІКІХ МАШТАБАЎ

НА ПАДЗЕЮ, якую мы хочам асэнсаваць, варта зірнуць з розных пунктаў гледжання. Вачам сучаснікаў яна прадстаўляецца ўзрушваючая і хвалюючая сваёй навізной. З адлегласці часу лягчэй усвядоміць непраходзячае значэнне здзейсненага, дакладна ўявіць яго месца ў нетаропкай чарадзе гістарычных дат.

Але пад якім бы вуглом мы ні разглядалі аблічча дзесятай пяцігодкі, галоўным застаецца пачуццё гордасці і захаплення ад дзёрзкай велічы яе жыццесцвярджальных планаў. **«Савецкая эканоміка перыяду дзесятай пяцігодкі—эканоміка сапраўды велізарных маштабаў»**,—сказана ў Справаздачным дакладзе ЦК КПСС XXV з'езду.

Маштаб нашых пяцігодак... Калі я спрабую ўявіць велічыню, якой наглядна можна было б праілюстраваць гэтае паняцце, успамінаюцца падзеі, што разгарнуліся некалькі год назад на ўскраіне горада Бабруйска. Пачатак ім паклаў зусім кароткі радок з Дырэктыў XXIV з'езда КПСС: «Пабудаваць і ўвесці ў дзеянне Беларускі шынны камбінат».

Нават чалавеку з багатай фантазіяй цяжка было паверыць, што ўсяго за 3—4 гады на пустэчы паўстане прамысловы волат, якому не будзе роўных у Еўропе. Аднак камбінат вырас. І цяпер, пад'язджаючы да некалі глухога райцэнтра, бачыш панараму, перад якой немагчыма застацца абыякавым: гіганцкі—не ахопіш вокам—індустрыяльны комплекс, шырокія аўтастрады, што прыводзяць у зусім новы, быццам з вокладкі турысцкага праспекта, горад...

Такая рэальная вага аднаго радка плана мінулай пяцігодкі. У праекце юбілейнай, дзесятай, пяцігодкі такіх радкоў яшчэ больш. Ды і насычэнне кожнага з іх стала куды больш важкім. **«...Нацыянальны даход плануецца давесці ў 1980 годзе да 457,5 мільярда рублёў, гэта значыць, павялічыць на 96 мільярдаў. Прадукцыя прамысловасці ўзрасце амаль на 197 мільярдаў рублёў і перавысіць 720 мільярдаў»**,—адзначана ў Справаздачным дакладзе ЦК КПСС.

Гэтыя велізарныя лічбы—выражэнне ўпэўненасці і аптымізму, з якім наша краіна глядзіць у будучыню. А ўпэўнены мы таму, што маем за плячыма вопыт чатырох з палавінай дзесяцігоддзяў, лёс якіх вызначаўся пяцігадовымі планамі. Усім ім без выключэння былі ўласцівыя ўстойлівыя тэмпы развіцця народнай гаспадаркі, паслядоўнае рашэнне ўсё больш шырокага кола сацыяльных праблем, паступовае пераразмеркаванне нацыянальнага даходу дзеля росту дабрабыту народа.

Дзесятая пяцігодка ў гэтым сэнсе не выключэнне. **«Па сваіх галоўных задачах**,—сказаў на XXV з'ездзе Л. Брэжнеў,—**па асноўных напрамках гаспадарчай дзейнасці дзевяты і дзесяты пяцігадовыя планы з'яўляюцца як бы адным цэлым. Гутарка ідзе аб даўгачаснай арыентацыі эканамічнай палітыкі партыі».**

І ўсё ж, захоўваючы асноўную эканамічную стратэгію, якая зводзіцца да няўхільнага ўздыму матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця народа шляхам паскоранага развіцця гаспадаркі, партыя прымяняе новую тактыку. Сутнасць яе ёмка выказана ў формуле, выпрацаванай КПСС: дзесятая пяцігодка—пяцігодка якасці і народнага дабрабыту.

Так, мы зараз багатыя, як ніколі. Наша эканоміка не ведае крызісаў, а тэмпы яе развіцця такія, што за апошняе дзесяцігоддзе індустрыяльны патэнцыял краіны падвоіўся. Але для таго, каб захаваць такія шпаркія тэмпы і ў будучым, трэба ўжо зараз паклапаціцца аб больш эфектыўным выкарыстанні наяўных фінансавых і вытворча-тэхнічных рэсурсаў.

«Работа чакаецца велізарная. Па сутнасці справы, трэба дабіцца глыбокіх якасных зрухаў у структуры і тэхнічным узроўні народнай гаспадаркі, істотна змяніць само яе аблічча... Праблему якасці мы разумеем вельмі шырока. Высокая якасць — гэта зберажэнне працы і матэрыяльных рэсурсаў, рост эканамічных магутнасцей, а ў канчатковым выніку, яшчэ больш поўнае задавальненне патрэбнасцей грамадства».

Вытрымка ўзята са Справаздачнага даклада ЦК КПСС. Але падобныя тлумачэнні задачы дня мне не раз даводзілася чуць раней, у гутарках з рабочымі. А гэта—доказ таго, што праблема, вызначаная партыяй як асноўная, знойдзе самую шырокую падтрымку працоўных.

ДЗЕСЯТАЯ пяцігодка будзе часам рашучых намаганняў па ажыццяўленню праграмы ўздыму сельскай гаспадаркі, абвясціў XXV з'езд КПСС.

Ніводзін аспект новага пяцігадовага плана не выклікаў у нашых зласлівцаў такой раз'юшанай рэакцыі, як гэты. Яшчэ б! Прахам пайшоў адзін з асноўных «тэзісаў» крытыкаў сацыялізму—быццам бы калектыўны спосаб гаспадарання на зямлі не здолеў забяспечыць прагрэс у сельскай гаспадарцы.

Вынікі мінулай і планы бягучай пяцігодак засведчылі ўсяму свету, што сацыялістычная сельская гаспадарка можа вырашаць самыя складаныя задачы. За гэтыя гады сотні нашых суайчыннікаў наведалі Беларусь. Што ўбачылі яны на месцы некалі забітых галечай вёсачак? Сучасныя багатыя гаспадаркі, шырокія палі замест балот, новыя механізаваныя фермы, дастатак у хатах калгаснікаў. Усё гэта плён калектыўнага гаспадарання на зямлі, клопатаў дзяржавы аб развіцці сяла.

Здабыткі бягучага пяцігоддзя будуць яшчэ багацейшымі. **«...Партыя ставіць дзве ўзаемазвязаныя мэты. Першая: дабіцца надзейнага забеспячэння краіны прадуктамі харчавання і сельскагаспадарчай сыравіны, заўсёды мець для гэтага дастатковыя рэзервы. І другая: ісці ўсё далей па шляху збліжэння матэрыяльных і культурна-бытавых умоў жыцця горада і вёскі».**

172 мільярды рублёў або больш чвэрці агульнага аб'ёму капіталаўкладанняў накіроўваецца на гэтыя мэты. Узмоцненая апора на «трох кітоў» земляробства—механізацыю, меліярацыю і хімізацыю—канчаткова ператворыць савецкую сельскую гаспадарку ў сучасную высокаразвітую і эфектыўную галіну эканомікі. Перспектыва надзвычай шырокая. Мо таму так узнёсла сказаў аб ёй Генеральны сакратар ЦК КПСС Л. Брэжнеў: **«Есць такі просты, вядомы ўсім выраз «квітнеючы край». Так называюць зямлю, дзе веды, вопыт людзей, іх прыхільнасць, іх любоў да прыроды, сапраўды твораць цуды. Гэта наш, сацыялістычны шлях».**

САМАЯ высакародная задача, якую паставіла перад сабой партыя камуністаў,—выхаванне гарманічна развітай асобы, чалавека новай, камуністычнай фармацыі. На гэта, урэшце, накіравана і гаспадарчая палітыка КПСС, якая галоўнай мэтай ставіць стварэнне такога матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця, калі савецкі чалавек змог бы цалкам праявіць свае творчыя здольнасці.

«Савецкая эканоміка дасягнула такой стадыі, калі задавальненне патрэбнасцей людзей у прадметах спажывання высокай якасці, як і выкарыстанне ў працэсе вытворчасці навейшай тэхнікі і тэхналогіі, становіцца ўмовай далейшага руху наперад... Камуністы—не прыхільнікі аскетызму, штучнага абмежавання патрэбнасцей людзей. Наадварот, уласцівае камуністычнаму грамадству поўнае і свабоднае раскрыццё ўсіх здольнасцей чалавека, яго творчых сіл прадугледжвае і стварэнне спрыяльных матэрыяльных умоў жыцця».

Статыстыка сведчыць: кожныя 15 год рэальныя даходы савецкіх грамадзян падвойваюцца. За дзевятую пяцігодку на 20 працэнтаў вырасла заработная плата рабочых і служачых, павялічыліся пенсіі, стыпендыі, аб'ём бясплатных паслуг. Бягучая пяцігодка будзе пятай запар пяцігодкай масавага жыллёвага будаўніцтва і ў многім зменшыць вастрыню гэтай праблемы. На 18 працэнтаў вырасце заработная плата, на 30—выплаты з фондаў грамадскага спажывання. Будзе шмат зроблена па забеспячэнню духоўных патрэб людзей—больш стане друкавацца кніг, у самыя аддаленыя раёны прыдзе тэлебачанне, адкрыюцца новыя тэатры, бібліятэкі, палацы спорту...

І яшчэ адзін слушны аспект у перспектывах пяцігодкі хочацца вылучыць. **«Дзесяты пяцігадовы план**,—падкрэслена на XXV з'ездзе,—**як і ўсе пяцігадовыя планы,—будзе праграмай развіцця ўсіх рэспублік, нацый і народнасцей, якія ўтвараюць нашу вялікую сацыялістычную Радзіму. Эканамічны і сацыяльны прагрэс савецкага грамадства—гэта прагрэс Расійскай Федэрацыі, Украіны і Казахстана, Беларусі і Малдавіі, рэспублік Сярэдняй Азіі, Прыбалтыкі, Закаўказзя».**

Вячаслаў ХАДАСОЎСКІ.

ЗАМЕЖНЫЯ ВЫСТАЎКІ Ў МІНСКУ

«Бульба-76». Пад такой назвай пройдзе ў канцы ліпеня—пачатку жніўня адна з самых буйных замежных спецыялізаваных выставак гэтага года ў Мінску. Чакаецца, што ў ёй будуць удзельнічаць прадпрыемствы і фірмы 15—20 краін. Сябры з ГДР, ПНР і іншых сацыялістычных дзяржаў азнаёмяць з машынамі, абсталяваннем і прыборамі для механізацыі вырошчвання, уборкі і перапрацоўкі бульбы, створанымі на аснове спецыялізацыі, кааперавання і сумесных распрацовак у рамках Комплекснай праграмы СЭУ. Сваю тэхніку для бульбаводства прадэманструюць фірмы ФРГ, Англіі і іншых краін.

Крыху раней, у маі — чэрвені, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Гандлёва-прамысловай палаце БССР, адбудзецца вялікая замежная спецыялізаваная выстаўка «Камбікормаш-76». Абсталяванне для прамысловасці камбікармоў і перапрацоўкі другаснай сыравіны на кармавыя мэты паказваюць прадпрыемствы і фірмы ПНР, Францыі, Фінляндыі, ФРГ і многіх іншых краін.

Найбольш «ураджайным» на выстаўкі будзе красавік. У пачатку месяца спецыялісты і госці Мінска пабываюць на выстаўцы «Прыборы для біяхіміі і клінічнага аналізу».

Шведскія фірмы-выканаўцы, якія ўваходзяць у «ЛКБ прыборы», прывязуць новыя хімікаты для даследавання бялкоў, ферментатары для лабараторый і прамысловага прызначэння, спектрафотамеры, ЭВМ для ферментацыі, газавай храматаграфіі і спектраметрыі і іншыя матэрыялы і абсталяванне.

У красавіку Мінск наведае таксама аўстрыйская фірма «Адрэсограф мульціграф». У ліку яе экспанатаў — наборна-пішучыя машыны, аўтаматы для афсетнага друку, фотанаборныя ўстаноўкі, капіравальныя аўтаматы, прыстасаванні для размнажэння копій.

Завершыць гэты выставачны месяц шведская фірма «СКФ ост Кугельлагергезельшафт». Яна пакажа прыстасаванні, канструкцыі для мантажу, дэмантажу і прафілактыкі падшыпнікаў з дэманстрацыяй іх у дзеянні.

● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ

НА ФЕРМЕ— ТЭЛЕКАМЕРЫ

Саўгас «Парахонскі» Пінскага раёна створаны на меліяраваных землях Палесся. Цяпер у вытворчых карпусах гаспадаркі ўстанаўліваецца навейшае тэхналагічнае абсталяванне для аўтаматызацыі вытворчасці жывёлагадоўчай прадукцыі. Манцыруецца тэлевізійная ўстаноўка. Ля цэнтральнага дыспетчарскага пульта будзе дзяжурыць аператар-заатэхнік.

Тэлевізійныя камеры даюць магчымасць поўнасцю аўтаматызаваць кіраванне на фермах, якія стануць буйнымі пастаўшчыкамі малака і мяса. У перспектыве аналагічныя тэлевізійныя ўстаноўкі вытворчага прызначэння знойдуць шырокае прымяненне і ў іншых новых саўгасах.

ДЛЯ ВІЦЕБСКІХ СТУДЭНТАЎ

Прыняты ў эксплуатацыю новы чатырохпавярховы навучальны корпус Віцебскага індустрыяльна-педагагічнага тэхнікума.

Студэнты атрымалі 40 прасторных аўдыторый і лабараторый, аснашчаных сучаснымі тэхнічнымі сродкамі, 8 навучальных майстэрань, чытальную залу на 200 месц.

У БЯДЗЕ НЕ ПАКІНУЛІ

Вялікая бяда напаткала калгасніка калгаса «Прагрэс» Навагрудскага раёна Вячаслава Басюка. У яго згарэла хата. Было б гэта за старым часам, доўга давялося б гараваць чалавеку. Але калгас, сельскі Савет не пакінулі яго ў бядзе. Праўленне выдзеліла будаўнічы матэрыял, звяно вопытных майстроў прыступіла да кладкі сцен. Сельскі Савет выдзеліў шыфер і іншыя матэрыялы.

ТАРЖОК — ЖОДЗІНА

Пачаліся работы па пракладцы газаправода ў 30-тысячны горад аўтамабілебудаўнікоў Жодзіна. Прыродны газ будзе паступаць ад магістральнага газаправода Таржок — Мінск — Івацэвічы.

ЮБІЛЕЙ ШКОЛЫ

Старэйшая на Слонімшчыне 5-я сярэдняя школа адзначыла 25-годдзе з дня аднаўлення. Пасля вызвалення Слоніма ад гітлераўцаў ад школы засталіся сцены ды папяліўча. З таго часу тут вырас цэлы гарадок з вучэбнымі майстэрнямі, спорткомплексам, сталовай і іншымі пабудовамі. У галоўным корпусе налічваецца адзінаццаць класаў-кабінетаў, шмат лабараторый.

ЗАЛАТОЕ ВЯСЕЛЛЕ

Гэты дзень у жыцці пенсіянераў са Слуцка Івана Аляксандравіча і Ганны Васільеўны Ракоўскіх быў асабліва памятным. Да іх у хату прыйшлі сямёра дзяцей, сямёра ўнукаў, сваякі, сябры. Сабраліся, каб адсвяткаваць залатое вяселле Ракоўскіх.

Да позняга вечара ў доме № 24 па вуліцы імя Жукава гучалі песні, музыка, вясёлыя галасы гасцей.

Каля 7 мільёнаў пар абутку ў год выпускае Гродзенская абутковая фабрыка «Нёман». Толькі сёлета гродзенскія абутнікі выпусцяць 146 відаў вырабаў, з іх 100 новых мадэляў. НА ЗДЫМКУ: такі абутак робяць у Гродна.

Фота Я. КАЗЮЛІ.

● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ

НА АДПАЧЫНАК У ПРАФІЛАКТОРЫЙ

Першых адпачываючых прыняў новы санаторый-прафілакторый «Сосны» магілёўскага вытворчага аб'яднання «Хімвалакно» імя У. І. Леніна. Здраўніца хімікаў пабудавана ў маляўнічым сасновым лесе, на беразе Дняпра. Да паслуг рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых, якія сюды прыехалі, — прасторныя двухмесныя палаты з усімі выгодамі. За 24 дні яны змогуць тут не толькі добра адпачыць, але і паправіць здароўе. Лячэбныя кабінеты аснашчаны навейшым медыцынскім абсталяваннем. Побач з санаторыем-прафілакторыем адкрыты падземныя сховішчы мінеральных вод, якія таксама будуць выкарыстоўвацца для лячэбных мэт.

Першы корпус новай здраўніцы разлічаны на 300 месц. Сёлета намячаецца ўвесці ў строй і другі корпус на 150 месц. З уводам яго тут штогод будзе папраўляць сваё здароўе кожны трэці работнік аб'яднання.

Гэтымі днямі адкрываецца загарадная спартыўна-аздараўленчая база адпачынку «Зялёны гай» на 120 месц. Былы прафілакторый завода штучнага валакна імя Куйбышава цяпер пераабсталёўваецца ў сямейны дом адпачынку.

спосаб жыцця—савецкі

ПРЭМІЯ ЗА ПРАЦУ — АЎТАМАБІЛЬ



Барвовы сонечны дыск, выслізнуўшы з абдымкаў нізкіх калматых хмар, шчодрым святлом заліў прыпушанае снегам наваколле, рознакаляровымі вясёлкамі сыпнуў па вокнах дамоў. Алена Сцепановіч на хвіліну нават прыцішыла крок, любуючыся гэтым залацістачырвоным разлівам. Як змянілася іх вёска! Новыя двух- і трохпавярховыя дамы выраслі на месцы старых сялянскіх хацін. Толькі за апошнія пяць гадоў каля 200 сем'яў хлебаробаў справілі наваселлі, усяліліся ў новыя кватэры. Сёння калгас нагадвае велізарную будаўнічую пляцоўку. Толькі за апошнія гады тут пабудаваны дзесяткі жылых дамоў, магазінаў, Палац культуры, будынак сярэдняй школы. Завяршаецца ўзвядзенне зімовага плавальнага басейна.

Змяніўся і характар працы. Большасць работ у паляводстве і жывёлагадоўлі выконваецца машынамі. Усё гэта патрабуе дадатковых ведаў. Толькі ў Снове, цэнтры калгаса імя Калініна Нясвіжскага раёна, 100 чалавек з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Нямала знатных людзей вырасла тут за пасляваенныя гады. Дзеці былых беднякоў сталі настаўнікамі, інжынерамі, аграномамі, урачамі.

Толькі нядаўна вярнуліся ў гаспадарку з дыпломамі інжынераў былыя калгасныя стыпендыяты Сяргей Шарапа і Мікалай Курыла. Усяго цяпер у інстытутах і тэхнікумах займаюцца 15 калгасных стыпендыятаў, 12 хлебаробаў — студэнты-завочнікі. І сама Алена Андрэеўна збіраецца сесці за падручнікі — набытых у школе ведаў яўна не хапае.

Успомнілася нядаўняя размова з бацькам. Неяк, разгаварыўшыся пра жыццё-быццё, бацька спытаў:

— Дачушка, а мо хопіць ужо на ферме працаваць табе! Можна і на лягчэйшую работу ўладкавацца.

Не адразу знайшла яна, што адказаць бацьку. Сапраўды, семнаццаць год працуе свінаркай. Клопатаў хапае. І ўсё ж пачуццё таго, што праца прыносіць карысць людзям, што яе паважаюць у калектыве, радуе і напаўняе пачуццём гордасці. Ды і гонар які за работу! Ордэнамі Леніна і Кастрычніцкай Рэвалюцыі ўзнагародзілі. І зноў жа за працу прэміявалі на выстаўцы ў Маскве легкавым аўтамабілем. Летась аднавяскоўцы дэпутатам сельскага Савета выбралі. Цяпер яна разам з іншымі, самымі паважанымі ў вёсцы людзьмі, вырашае многія важнейшыя задачы.

— Не, тата, — крыху памаўчаўшы, адказала Алена Андрэеўна. — Ніякай іншай работы мне не трэба. Ды і працаваць цяпер стала лягчэй. Вунь які комплекс узвялі. Не ферма — цэлая фабрыка.

Алена Андрэеўна прыбавіла кроку. А вось і яе падворак. Сёння за думкамі і ўспамінамі не заўважыла, як і прыйшла. З прыемным пачуццём пераступіла парог сваёй хаты. Скончыўся яшчэ адзін працоўны дзень.

У. ГОЙТАН.

НА ЗДЫМКАХ: вуліца ў калгасе імя Калініна Нясвіжскага раёна; Алена Сцепановіч ля атрыманага ў прэмію аўтамабіля; у калгасным Палацы культуры; сельскія спартсмены.

Фота М. АМЕЛЬЧАНКІ.

СЁННЯ ЛЕПШ, ЧЫМ УЧОРА

Было гэта ў самым пачатку мінулай пяцігодкі, калі на мінскім гадзіннікавым заводзе «Прамень» толькі-толькі разгортвалася спаборніцтва за датэрміновае выкананне яе планаў. Тады наладчык Аляксандр Карпенка сказаў таварышам: «Выканаю сваё пяцігадовае заданне за чатыры гады». У той час гэта быў не толькі адзін з першых пачынаў на заводзе, але і наогул у горадзе.

Рабочы стрымаў сваё слова і цэлы год працаваў у лік 1976 года. У імя чаго патрэбна было Аляксандру напружваць свой вытворчы графік, робячы кожны дзень значна больш, чым патрабуе норма? Можа, дзеля славы? Тыя, хто добра ведаюць Карпенку, так аб ім ніколі не скажуць. Бо і ў мінулай пяцігодцы Аляксандр працаваў выдатна і быў узнагароджаны ордэнам Леніна. Хутчэй за ўсё справа тут у тым, як рабочы разумее свой грамадзянскі абавязак. Справу, якой ён займаецца кожны дзень, Аляксандр лічыць важнай не толькі для сябе асабіста, а і для ўсяго грамадства. Для яго мала самому працаваць выдатна, важна, каб таварышы побач ведалі не менш і ўмелі працаваць не горш за яго.

— На заводзе я з дня яго заснавання,— расказвае Аляксандр.— За гэты час сам добра вывучыў абсталяванне і падрыхтаваў шмат маладых наладчыкаў. Стараюся быць для вучняў не толькі майстрам сваёй справы, але і проста добрым таварышам і дарадчыкам у жыцці. Калі я выступаў з пачынам аб датэрміновым выкананні пяцігодкі, быў упэўнены, што мяне падтрымаюць мае вучні. Так і здарылася. Пачын падтрымалі многія маладыя рабочыя.

Такім чынам, Аляксандр Карпенка, выступаючы з пачынам, думаў не аб сабе. Ён імкнуўся перадаць свой энтузіязм, свае веды іншым. І ў выніку ў выйгрышы аказаліся і завод, і дзяржава, і, нарэшце, пакупнікі. Бо за сухімі лічбамі працэнтаў хаваюцца тысячы выдатных гадзіннікаў.

Аляксандр Карпенка не адзінокі. У апошнім годзе дзевятай пяцігодкі спаборніцтва за паспяховае выкананне вытворчых заданняў набыло на прадпрыемстве шырокі размах.

Новы этап сацыялістычнага спаборніцтва наступіў з пачаткам дзесятай пяцігодкі. Я пазнаёміўся з брыгадай, якую ўзначальвае Галіна Палтаржыцкая. Летась дзяўчаты з брыгады сабралі звыш плана 1 450 гадзіннікаў і ўстанавілі своеасаблівы рэкорд: такой колькасці дадатковай прадукцыі не давала ні адна брыгада.

— Сёлета мы паставілі перад сабой мэту перакрыць леташнія паказчыкі,— гаворыць брыгадзір.— У праекце новай пяцігодкі — складаныя задачы. Мы ўважліва вывучылі гэтыя лічбы планаў і мяркуем, што можам не толькі паспяхова справіцца з заданнямі, але і перавыканаць іх.

У шматтысячным калектыве Мінскага гадзіннікавага завода нямала рабочых, якія з першых дзён дзесятай пяцігодкі ўзялі на сябе абавязацельствы працаваць сёння лепш, чым учора. Гэтага патрабуюць адказныя задачы пяцігодкі, гэтага вымагае іх рабочае сумленне.

С. ПЛАСКОВІЧ,
інжынер Мінскага гадзіннікавага завода «Прамень».

РОДИНА ОДНА...

Родина в мире одна...

Строчка из случайно прочитанного несколько лет тому назад стихотворения навсегда врезалась в память особой точностью определения такого близкого слова — Родина. Я вспоминал ее вновь и вновь, перечитывая собранные в большой папке письма людей, добровольно покинувших нашу Родину. Теперь они слезно просят, умоляют разрешить им вернуться в родные места.

Однако обо всем по порядку. Тридцать лет прошло после окончания войны. Но до сих пор встречаются семьи, члены которых оказались разбросанными по различным государствам. Понятно стремление этих людей снова встретиться и жить вместе с родственниками.

Забота о людях — один из важнейших принципов нашего общества. Именно поэтому Советское правительство в позитивном и гуманном духе рассматривает просьбы лиц, желающих воссоединиться с членами своей семьи. Люди, письма которых я читал, тоже обратились за разрешением на выезд и получили его.

Сейчас трудно сказать, что послужило основной причиной отъезда. Были тут искреннее желание воссоединиться с родными и настоятельные уговоры родственников, проживающих за границей, а также советы других лиц, заинтересованных в этом совсем по другим причинам. Было и наивное представление, возникшее под влиянием передач зарубежных радиостанций и писем «оттуда» о том, что там, за границей, живется легче, что все там лучше и интереснее, чем дома. Очень многим из уехавших пришлось расстаться со своими иллюзиями почти сразу же после прибытия в чужую страну. Дело не только в том, что отношения между родственниками приобретают подчас весьма сложный характер и создают конфликтные ситуации. Для людей, оторванных от привычной среды, очутившихся в чужой, незнакомой стране, это особенно тяжело.

В июле прошлого года из Советского Союза на постоянное жительство в ФРГ к дочери выехала Анна Яковлевна Сандина. Однако счастье воссоединенной семьи длилось всего несколько недель. Уже в сентябре ее «любящая» дочь заявилась в консульский отдел посольства СССР в ФРГ и буквально потребовала, чтобы ее мать отправили обратно на Украину. Учитывая безвыходное положение А. Я. Сандиной, ей была предоставлена возможность вернуться к сестрам и другой дочери, проживающим в Черниговской области.

Такая же судьба постигла Альвину Ивановну Шруль, которая приехала к сыну в незнакомый западногерманский город, а затем, столкнувшись с обстоятельствами, стала молить о возвращении на Родину. Ей тоже пошли навстречу и разрешили вернуться в Молдавию.

Дело, повторяем, не в семейных неурядицах. Судя по письмам, поступающим в советские учреждения в ФРГ, решающую роль играют трудности с устройством на работу и с жильем, а главное — неприемлемость самого уклада жизни в капиталистической стране.

В апреле прошлого года в ФРГ с мужем и дочерью из г. Черновцы выехала Антонина Григорьевна Назарюк. Уезжала она с болью в сердце, не хотелось покидать родные края. Через несколько недель от нее было получено письмо: «Я не могу тут жить, — писала Антонина Григорьевна. — Не могу привыкнуть к этому строю и порядкам. Да я и не хочу привыкать. Я очень тоскую по Родине. Тут я поняла, что лучше умереть, чем жить так. Мы с дочкой Мариной 14 лет очень хотим вернуться на Родину, где мы жили, в г. Черновцы. Очень вас прошу, помогите нам вернуться. Дальнейшая наша с дочерью жизнь тут не представляется возможной, так как мы с ней советские люди и попали сюда по ошибке...»

Воспитанные при социалистическом строе, советские люди воспринимают зафиксированные в Конституции СССР основные права — на труд, отдых, образование, как нечто само собой разумеющееся. К сожалению, многие из выехавших на постоянное жительство за границу по-настоящему оценивают преимущества социалистического общества, лишь на себе испытав унизительное бесправие и дискриминацию, обычные в условиях капитализма.

Радиотехник - конструктор А. Дорогина (фамилия изменена) в Западной Германии долгое время не могла устроиться на работу. Правда, на бирже труда ей предложили сразу три места... уборщицы. Когда же она отказалась, ей заявили: «Здесь вы никогда не получите работу по вашей специальности». Разговаривали с ней грубо, даже пригрозили, что в случае отказа от места уборщицы ее могут лишить пособия по безработице и она останется без каких-либо средств к существованию. В письме Дорогина рассказывает о своей жизни в ФРГ: «Отношение к нам лично тяжелое. Считают, что мы люди неграмотные, плохо знаем немецкий язык и здешние законы. Обманывали нас, где только могли».

Приехавшая на постоянное жительство в Федеративную Республику Германии семья Г. рассчитывала, что старший сын, закончивший в Советском Союзе школу - десятилетку, сможет продолжать учебу в одном из западногерманских университетов. Но надеждам не суждено было сбыться. Когда юноша подал заявление о приеме, ему ответили, что среднее образование, полученное в СССР, в ФРГ не признается и об учебе в университете ему лучше забыть.

В официальных материалах, предназначенных, кстати говоря, для советских граждан и опубликованных на русском языке, излагается следующая выдержка из статьи 3 конституции ФРГ: «Никто не может быть ограничен в правах или обладать какими-либо преимуществами вследствие своего происхождения, расы, языка, страны рождения, убеждений, религиозных и политических взглядов».

Те, кто пробыл хоть немного в Западной Германии, знают, что в действительности все обстоит совсем не так, как красиво записано на бумаге. По настоянию реакционных кругов этой страны прогрессивные люди, в первую очередь коммунисты, подвергаются открытой дискриминации. Их увольняют с различных должностей в государственных учреждениях, не говоря уже о частных фирмах, запрещают заниматься преподавательской деятельностью. О том, какой размах принимают в ФРГ гонения на инакомыслящих, свидетельствует тот факт, что среди жертв административных и судебных инстанций есть даже социал-демократы — члены партии, входящей в правительство.

«В ФРГ мы живем уже 3 месяца, и с каждым днем нам становится все яснее, что мы сделали ошибку, уехав из Советского Союза, — говорится в одном из писем, полученных советским учреждением в этой стране. — Мы всю жизнь прожили в Советском Союзе, учились, выросли, работали. Здесь, в ФРГ, для нас все чуждо, мы не можем примириться с капиталистическим укладом жизни».

Анна и Альберт Шмоль вместе с сыном Теодором в декабре прошлого года получили визы для возвращения из Западной Германии в Советский Союз. Этому предшествовало их письмо советским властям, в котором говорилось: «Мы обращаемся к вам с мольбой и просьбой: помогите нам вернуться домой, в Россию. Мы выехали в ноябре 1974 года. Думали, что едем на свою родину, а оказывается, мы глубоко ошиблись. Мы прожили 9 месяцев и решились просить вас: помогите нам вернуться назад!».

Уже приехавшие обратно в Советский Союз из ФРГ и вновь получившие советское гражданство люди рассказывали, что желание вернуться высказывали и их знакомые, также прибывшие туда в порядке воссоединения с семьей. Все они говорили, что не могут жить в капиталистической стране, с чуждым советским людям укладом жизни, неприемлемыми моральными устоями, где между людьми отсутствует выручка и взаимопомощь, где местные толстосумы пренебрежительно относятся к прибывшим из Советского Союза семьям.

Поэтому понятна великая радость людей, которые, приняв на этот раз правильное решение, вновь обрели свою Советскую Родину.

Родина в мире одна...

В. КУКУШКИН.

Што? * Як? * Чаму?

ЛІТАРАТУРНЫЯ АБ'ЯДНАННІ

Каб стаць пісьменнікам, аднаго жадання, вядома, мала. Трэба мець, як кажуць, іскру ў душы, але яе можна і не заўважыць, і з цягам часу гэтая іскра пагасне. Застанецца на ўспамін аб ёй тоненькі вучнёўскі сшытачак з некалькімі вершамі альбо з першым і ў той жа час апошнім апавяданнем. Потым дзеці адшукаюць яго сярод сямейных рэліквій і здзівяцца: трэба ж — наш тата вершы пісаў! Тата, а чаму ты не стаў пісьменнікам?

Творчасць, якая б яна ні была, патрабуе прызнання. Напісаны першы верш, першая мелодыя, зроблены першы мазок — трэба, каб нехта сказаў: як, добра ці не? І вось малады аўтар, набраўшыся адвагі, нясе свой першы твор на суд... У рэдакцыю мясцовай газеты. Напрыклад, бабруйская газета «Камуніст» атрымлівае штодня некалькі пісем з вершамі. Іх дасылаюць аграном калгаса Мікалай Цярэшчанка, рабочы Аляксандр Цімко, інжынер Іван Куцця, студэнтка Таццяна Салівон і яшчэ шмат хто. Пры рэдакцыі газеты існуе літаратурнае аб'яднанне, створанае больш як пяцьдзесят гадоў назад Міхасём Лыньковым — у той час рэдактарам бабруйскага «Камуніста». Раз у месяц збіраюцца пачынаючыя паэты і празаікі на пасяджэнні аб'яднання, чытаюць і абмяркоўваюць свае новыя творы, лепшыя прапануюць для друку на «Літаратурнай старонцы» газеты.

У госці да маладых літаратараў завітваюць беларускія паэты Мікола Аўрамчык, Аляксей Зарыцкі, якія родам з Бабруйшчыны і ў свой час таксама былі членамі гэтага аб'яднання. Найбольш часта наведваецца ў Бабруйск паэт Аляксей Пысін, які жыве ў Магілёве і кіруе абласной пісьменніцкай арганізацыяй. Пачуць слушнае слова ад такога сталага і вядомага пісьменніка — для пачаткоўца вялікая карысць. Ён раскрые таямніцы паэтычнай творчасці, пакажа малавядомыя ці забытыя памеры вершаскладання... Адным словам — будзе вучыць нялёгкаму рамяству паэта.

Пад уважлівым наглядам Саюза пісьменнікаў Беларусі ў нашай рэспубліцы працуе каля паўтараста такіх вось літаратурных аб'яднанняў — пры рэдакцыях газет і часопісаў, у навучальных установах, на вялікіх прамысловых прадпрыемствах. Відаць, самым вялікім можна назваць аб'яднанне «Узлёт» пры Беларускім дзяржаўным універсітэце. З яго выйшлі вядомыя зараз у беларускай літаратуры пісьменнікі. Калі да залатога юбілею універсітэта літаб'яднанне выпусціла свой зборнік, у якім змясціла па аднаму вершу сваіх былых членаў, атрымаўся салідны паэтычны том, у змесце якога стаяла больш сотні добра вядомых літаратурных імёнаў.

Да гэтага «ўзлётаўцы» ўжо выдалі чатыры калектыўныя зборнікі, у якія ўвайшлі лепшыя вершы членаў аб'яднання. Іншы раз дапазна гарыць святло ў вокнах другога паверха філалагічнага корпуса. Асабліва шумна і мнагалюдна праходзяць абмеркаванні новых вершаў. Нікому не забараняецца выказваць свае думкі наконт вартасці чыіх-небудзь вершаў, але крыўд не бывае — у аб'яднанні пануе таварыскасць. Апошнія дзесяць гадоў «Узлётам» кіруе прафесар і паэт Алег Лойка. Ён часта запрашае на пасяджэнні аб'яднання вядомых літаратараў і вучоных, якія расказваюць аб праблемах сучаснай прозы і паэзіі, аб наватарстве і традыцыях, аб законах сацыялістычнага рэалізму, пра авангардызм і іншыя буржуазныя плыні ў заходняй літаратуры. Літаб'яднанне — своеасаблівы літаратурны інстытут.

З тонкім вучнёўскім сшытачкам, дзе ад рукі перапісаны з дзесятак вершаў ці невялічкае апавяданне, адчыняюць дзверы літаратурных аб'яднанняў маладыя аўтары. Тут іх падтрымаюць, дапамогуць знайсці свой «голас», які б не згубіўся ў шматгалоссі нашай многанацыянальнай савецкай літаратуры. Адсюль, з літаб'яднання, атрымлівае звычайна малады паэт ці празаік пуцёўку ў выдавецтва, тут, у літаб'яднанні, ён супольна з таварышамі адкрые галоўную тэму дня, якой і прысвяціць сваю творчасць.

Але самае важнае тое, што праз літаб'яднанні ў літаратуру прыходзяць людзі розных прафесій, з вялікім жыццёвым багажом, не дылетанты, а знаўцы пэўнай, «сваёй» тэмы. Ад гэтага літаратура наша такая разнастайная, а ў творах пісьменнікаў раскрыты духоўны свет савецкіх людзей на ўсіх узроўнях — ад хлебароба да касманаўта.

САЦЫЯЛЬНАЕ СТАНОВІШЧА —СТУДЭНТ

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.].

ванне характару актыўнага барацьбіта за новае, прагрэсіўнае, імкненне да самаўдасканалення...

— Каб стаць студэнтам у нашай краіне, трэба паспяхова здаць экзамены і вытрымаць конкурс, бо жадаючых, наколькі я ведаю, бывае больш, чым месц на першым курсе.

— Так-так. Да таго ж варта адзначыць, што абітурыенты размяркоўваюцца па спецыяльнасцях неаднолькава: адзін год усе раптам жадаюць стаць фізікамі, на другі — журналістамі. Часам гэта бывае «модны ўсплёск», часцей — сведчанне прэстыжу той ці іншай прафесіі. Але заўсёды гуманітарныя факультэты больш папулярныя, чым тэхнічныя. Летась, напрыклад, на кожнае месца ў інжынерных вышэйшых навучальных установах прэтэндавалі 2—3 чалавекі, а на філалагічныя факультэты — 4—5.

— Чаму? Здавалася б, у час бурнага развіцця тэхнікі павінна быць наадварот.

— Вы так думаеце? А, можа, якраз гэтая прычына выклікае павышаную цікавасць да літаратуры, філасофіі, гісторыі — навук, што пазнаюць грамадства, яго праблемы?

— Мне неяк давялося чытаць, што ў амерыканскіх студэнтаў найбольш папулярнымі з'яўляюцца хімія, біялогія, кіра-

На Мінскім трактарным заводзе і ў будаўнічым упраўленні № 128, на заводах «Тэрмапласт» і шарыкападшыпнікавым працуюць члены вялікай рабочай сям'і Хмяльніцкіх.
НА ЗДЫМКУ: пасля працоўнага дня сабралася ля тэлевізара амаль уся сям'я Хмяльніцкіх.
Фота Я. КОЛЬЧАНКІ.

пишут земляки

СТАЛО ЛЕГЧЕ РАБОТАТЬ

Мы, живущие на чужбине, испытываем на себе положительные результаты наметившейся в последнее время в мире разрядки напряженности: стало легче дышать, все меньше трудностей в культурно-просветительной работе. Взять, к примеру, наш Народный дом в Ванкувере. В минувшем году в нем побывало множество людей, к нам стали заглядывать даже те, кто раньше сторонился. В клубе появились новые активные члены. Пополнился и хор. Среди новых хористов—двое итальянцев. Так что в Народном доме теперь полный интернационал: люди разных национальностей делают одно общее и очень полезное дело.

Сейчас все силы мы направили на то, чтобы успешно завершить кампанию по сбору средств на нашу любимую газету «Вестник».

Новый год встречали радостно, вместе с дорогими гостями — советскими моряками. Они также приняли участие в концерте, исполнили милую нам «Катюшу», известные во всем мире «Подмосковные вечера» и другие советские песни. Присутствующий на вечере член городского совета Гарри Ренкин в своем выступлении положительно оценил деятельность Народного дома, отметив высокую культуру всех его членов, их спаянность и большое желание внести посильный вклад в дело укрепления дружбы между народами и, в частности, между народами Канады и СССР.

25 января — второй заключительный концерт, доходы от которого пойдут в фонд «Вестника». А впереди еще, можно сказать, весь год. И запланировано много интересных дел. Будем стараться, чтобы все намеченное выполнить.

Мария и Владимир ГАВРИЦКИЕ.
Канада.

А ШУМУ-ТО, ШУМУ!..

Уже несколько дней подряд здесь разглагольствуют о каком-то математике, показывают его по телевидению, берут интервью, комментируют его высказывания. Внешне этот тип похож на тех, кто в свое время сотрудничал с фашистами. Да и нутро у него продажное: что ни слово — ложь о Советском Союзе.

Вспоминаю другого «борца», который несколько лет назад тоже был «героем» дня — лил грязь на советских людей. Теперь спросите у кого-нибудь в Италии: «Кто такой Солженицын?» — лишь немногие припомнят. А ведь сколько было шуму!

Конечно же, капиталистам выгодно выискивать таких людишек, чтобы использовать их в своих интересах, в борьбе против Советской страны. Но жизнь показывает, что эффект от таких «шоу» ничтожен, а их жалкие исполнители, совершив черное дело и получив свои тридцать сребреников, навсегда уходят со сцены, не задерживаясь в памяти людей.

Леонарда МАЛЕЕВА.
Италия.

НАДО БЫТЬ БДИТЕЛЬНЫМ

Что-то в последнее время мне нездоровится. Думал пойти к врачу, может, даже в больницу, но ведь там надо платить по 130 долларов в день. Не то, что в Советском Союзе, где люди получают бесплатную медицинскую помощь. Здесь — капиталистическая система. Здесь за все надо платить. И цены с каждым днем все выше. Инфляция охватила страну.

Все чаще можно услышать, как местные политиканы призывают к войне. Раньше трубили о Вьетнаме, теперь об Анголе. И все против нашей Родины. Даже президент выступил с угрозами. Да, капиталисты рвутся к войне, им нужна война. Тогда опять поднимутся прибыли и найдется работа для тех 8-ми миллионов безработных, которые сегодня числятся в официальной статистике. Сегодня империалисты вряд ли рискнут раздувать большой пожар мировой войны — ведь и самим можно обжечься. Но они готовы на авантюры в отдельных частях света. И потому надо быть бдительными.

Степан ЛИЛЕШ.
США.

за мяжой і дома

ЛАЦІНААМЕРЫКАНСКІЯ КАМУНІСТЫ Ў МІНСКУ

У Мінску з 6 па 8 сакавіка знаходзілася група прадстаўнікоў камуністычных і рабочых партый краін Лацінскай Амерыкі, якія ўдзельнічалі ў рабоце XXV з'езда КПСС.

Сярод гасцей — члены дэлегацый брацкіх партый Аргенціны, Балівіі, Бразіліі, Венесуэлы, Гватэмалы, Гаіці, Гандураса, Нікарагуа. Гасцей суправаджалі адказныя работнікі міжнароднага аддзела ЦК КПСС Ю. Ялюцін і Ю. Казлоў.

Члены дэлегацый мелі гутарку ў ЦК Кампартыі Беларусі. Сакратар ЦК КПБ А. Смірноў расказаў гасцям аб гераічнай барацьбе беларускага народа пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі ў гады Вялікай Айчыннай вайны супраць фашысцкіх захопнікаў, аб дасягненнях у развіцці народнай гаспадаркі Беларусі, азнаёміў са шматграннай дзейнасцю рэспубліканскай партыйнай арганізацыі па мабілізацыі працоўных на паспяховае ажыццяўленне рашэнняў партыйных з'ездаў і пленумаў ЦК КПСС, арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва працаўнікоў горада і вёскі за паспяховае выкананне планаў першага года дзесятай пяцігодкі.

У ходзе гутаркі сакратар ЦК КПБ А. Смірноў адказаў на шматлікія пытанні гасцей, якія датычаць розных бакоў сацыяльна-эканамічнага і культурнага жыцця рэспублікі.

Член выканкома ЦК Кампартыі Аргенціны Эктар Агосці ад імя членаў дэлегацый выказаў шчырую падзяку за магчымасць наведаць рэспубліку і пазнаёміцца з жыццём і працай беларускага народа.

Гутарка прайшла ў цёплай, дружалюбнай абстаноўцы.

Сардэчна сустрэў зарубежных гасцей калектыў Мінскага камвольнага камбіната. Ім была прадастаўлена магчымасць азнаёміцца з вытворчасцю, з работай прафілакторыя і Палаца культуры тэкстыльшчыкаў. Работнікі прадпрыемства расказалі гасцям аб поспехах камвольшчыкаў у выкананні заданняў дзевятай пяцігодкі, аб плане сацыяльнага развіцця калектыву.

Прадстаўнікі брацкіх партый наведалі Дом-музей I з'езда РСДРП і ВДНГ БССР, азнаёміліся з выдатнымі месцамі Мінска, пабывалі ў раёнах новага жыллёвага будаўніцтва, мелі сустрэчу ў Фрунзенскім райкоме КПБ г. Мінска.

Зарубежныя госці пабывалі ў санаторыі «Аксакаўшчына». У ходзе прайшоўшай тут гутаркі міністр аховы здароўя БССР М. Саўчанка расказаў аб паспяховым выкананні заданняў дзевятай пяцігодкі па паляпшэнню медыцынскага абслугоўвання працоўных, планах далейшага развіцця аховы здароўя ў рэспубліцы.

Прадстаўнікі брацкіх партый былі на вечары адпачынку рабочых і служачых Мінскага аўтамабільнага завода. Перад гасцямі з канцэртам выступілі ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці.

8 сакавіка пасланцы камуністычных і рабочых партый краін Лацінскай Амерыкі знаёміліся з гістарычнымі мясцінамі Мінска, звязанымі з гераічным мінулым беларускага народа. Яны наведалі Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, дзе знаёміліся з экспанатамі, якія расказваюць аб самаадданай барацьбе савецкага народа супраць гітлераўскіх захопнікаў. Адбылася хвалюючая сустрэча гасцей з удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны. Героі Савецкага Саюза Р. Мачульскі, В. Лівенцаў, І. Жыгараў, А. Мазанік, А. Кулагін расказалі аб шырокім размаху ўсенароднай барацьбы, якую ўзначаліла Камуністычная партыя, падзяліліся ўспамінамі.

Потым члены дэлегацыі зрабілі паездку на мемарыяльны комплекс «Хатынь», дзе ўсклалі кветкі ля Вечнага агню. Яны пабывалі таксама на Кургане Славы, усклалі да яго падножжа гірлянду кветак.

Вечарам 8 сакавіка члены дэлегацый брацкіх партый адбылі ў Маскву.

СУСТРЭЧА Ў КОНСУЛЬСТВЕ ГДР

Генеральны консул ГДР у Мінску Л. Волерт 9 сакавіка наладзіў сяброўскую сустрэчу ў сувязі з 20-годдзем утварэння Нацыянальнай народнай арміі Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі.

На сустрэчы, якая прайшла ў брацкай, сардэчнай абстаноўцы, былі таварышы У. Міцкевіч, Я. Нікулкін, М. Полазаў, А. Смірноў, У. Лабанок, член ваеннага савета — начальнік палітупраўлення ЧБВА генерал-лейтэнант А. Дзебалюк, іншыя прадстаўнікі партыйных, савецкіх і грамадскіх арганізацый, военачальнікі.

Перад удзельнікамі сяброўскай сустрэчы выступілі генеральны консул ГДР у Мінску Л. Волерт і першы намеснік камандуючага войскамі ЧБВА генерал-лейтэнант танкавых войск М. Зайцаў.

ванне. А вывучэнне англійскай мовы, напрыклад, гэта ледзь не гарантыя беспрацоўя пасля універсітэта.

— Бачыце, зноў усё тая ж сацыяльная праблема, з якой мы і пачалі гаворку. Нам з вамі, як і любому савецкаму чалавеку, відаць, нават немагчыма ўявіць сабе ў поўнай меры адчуванне таго, хто аказваецца непатрэбным грамадству, нягледзячы на свае веды і жаданне працаваць. Наш лад жыцця, наша выхаванне знітоўвае інтарэсы чалавека і грамадства, яны становяцца непадзельнымі, узаемазалежнымі: чалавек робіць усё дзеля грамадства, а яно дбае пра кожнага свайго члена.

— Фёдар Мікалаевіч, скажыце, калі ласка, як абстаяць справы са спецыялістамі па беларускай мове і літаратуры. Ніякіх складанасцей не ўзнікае ад таго, што патрэбу ў іх мае толькі наша рэспубліка?

— Удакладню спачатку, што ва ўсіх навучальных установах рэспублікі мы рыхтуем спецыялістаў перш за ўсё для Беларусі. Бывае, што пасылаем выпускнікоў у іншыя раёны Савецкага Саюза. Але няшмат і рэдка. А наконт філолагаў... Зразумела, настаўнік беларускай мовы і літаратуры на Украіне ці ў Эстоніі работы па спецыяльнасці не знойдзе. На філалагічных факультэтах у большасці вучацца дзяўчаты, і даволі часта яны выходзяць замуж за хлопцаў з Сібіры, Малдавіі, Грузіі... Што ж ім, на радзіме мужа мяняць прафесію? Не ў інтарэсах дзяржавы гэта. Выхад знайшлі такі: зрабілі спецыяльнасць больш універсальнай. Цяпер, акрамя беларускай, нашы выпускнікі маюць права выкладаць і рускую мову і літаратуру.

— Калі ў жніўні пачынаюцца ўступныя экзамены, вірлівыя натоўпы ля інстытутаў выклікаюць захапленне цягай юнакоў і дзяўчат да навукі, але адначасова ўзнікае пытанне: «Няўжо столькі спецыялістаў спатрэбіцца праз пяць гадоў?»

— Не хвалюйцеся, перавытворчасці не адбудзецца. Колькасць першакурснікаў узгоднена з перспектыўным планам развіцця народнай гаспадаркі. А план складаецца па разліках спецыялістаў, прагнозах сацыёлагаў і да т. п. Возьмем, як прыклад, тых жа філолагаў. Летась на першы курс БДУ імя У. І. Леніна прынята 125 чалавек на дзённае аддзяленне, па 50 — на вячэрняе і завочнае. Акрамя таго, настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры рыхтуюць педагагічныя інстытуты Мінска, Магілёва, Брэста, Віцебска, Гродна і Гомельскі універсітэт. Майце на ўвазе, што кожнай сярэдняй школе патрэбен не адзін, а некалькі настаўнікаў роднай мовы і літаратуры. Да таго ж, многія выпускнікі працуюць у выдавецтвах, рэдакцыях, інстытутах Акадэміі навук БССР.

— Ці не ўзнікае з нашай гутаркі малюнак бесклапотнага студэнцкага жыцця?

— Якое там бесклапотнае! Прыгадайце свае універсітэцкія гады. Студэнцтва істотна змянілася за апошні час. Юнакі і дзяўчаты цяпер не толькі рыхтуюцца да будучай актыўнай дзейнасці, а імкнуцца займацца ёю паўсядзённа. І студэнцкія навуковыя таварыствы, і будаўнічыя атрады — праяўленне жыццёвых патрэб.

У пачатку нашай гутаркі Вы задалі пытанне наконт праблем. Калі звярнуцца з ім да юнакоў і дзяўчат, адказы можна пачуць самыя розныя. Некага хвалюе сесія, другі б'ецца над курсавым праектам, трэці заклапочаны яшчэ нечым. І ў першую хвіліну яны шчыра і праўдзіва адкажуць, што вось гэтая праблема займае іх зараз найбольш, пакуль яна не вырашыцца, няма аб чым больш разважаць і да т. п. І хаця такія адказы можна назваць толькі міні-праблемамі, студэнты маюць рацыю. Па-першае, паўсядзённасць запоўнена нягучнымі справамі, без якіх немагчымы рух наперад, падругое, пра самае важнае ў жыцці, як правіла, не гавораць на кожным кроку. І сваю глабальную мэту кожны фармулюе па-свойму, з пытальнымі знакамі ці клічнікамі, але сутнасць яе зводзіцца да аднаго — стаць максімальна карысным для грамадства чалавекам.

ГЕАГРАФІЧНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ БЕЛАРУСКІХ ВУЧОНЫХ

Віктар ЗАЎРЫЕЎ,
доктар геаграфічных навук, прафесар БДУ імя У. І. Леніна

Беларускія географы-адзіночкі яшчэ да Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі праславілі айчынную навуку або пакінулі ў ёй значны след.

Так, выхадзец з Беларусі Бенядзікт Дыбоўскі напісаў цікавыя працы аб самым глыбокім возеры свету Байкале. Сын свяшчэнніка Бор Дабрынін аб'ехаў амаль усю Еўропу, напісаў шэраг падручнікаў для вышэйшых навучальных устаноў, выкладаў ва універсітэтах Масквы, Тбілісі, Кіева і інш. Яго работы па Заходняй Еўропе, пераклады на рускую мову прац вядомага французскага географа Мартона не страцілі свайго значэння да гэтага часу.

Значны ўклад у справу вывучэння Беларусі, асваення вялікіх забалочаных прастораў Палесся ўнесла экспедыцыя Н. Жылінскага. Адначасова з практычнай накіраванасцю гэтай экспедыцыі, яна мела на мэце вывучэнне прычын, якія садзейнічаюць балотаўтварэнню, а таксама ўплыву асушальных работ на клімат, сцёк рэк не толькі Палесся, але і прылягаючых да яго раёнаў. У гэтых мэтах прыцягваліся да работы вядомыя рускія вучоныя-географы В. Дакучаеў, А. Ваейкаў, К. Весялоўскі, Г. Танфільеў і іншыя.

Рабіліся спробы комплекснага прыроднага раяніравання тэрыторыі Беларусі. Да ліку найбольш навукова-абгрунтаваных з іх трэба аднесці раяніраванне, праведзенае К. Арсеньевым (1848 г.), а пазней Г. Танфільевым (1897 г.). Нарэшце, незадоўга да Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, у 1915 годзе В. Сямёнаў Цянь-Шаньскі на аснове геолага-геамарфалагічных фактараў выдзеліў на тэрыторыі дзве шыротныя паласы і чатыры тыпы мясцовасцей. Вядома, гэтыя работы мелі шмат недахопаў з-за малой вывучанасці тэрыторыі, аднак у свой час яны мелі значную навуковую, практычную і пазнавальную цікавасць, уносячы немалаважны ўклад у развіццё геаграфіі.

З устанаўленнем Савецкай улады ў Беларусі адкрыліся самыя шырокія магчымасці для развіцця ўсіх навук, у тым ліку і геаграфіі, без якой, асабліва цяпер, ва ўмовах бурнага развіцця навукова-тэхнічнага прагрэсу, немагчыма планаванне народнай гаспадаркі з максімальна беражлівым выкарыстаннем ужо вядомых прыродных рэсурсаў, адшуканне новых, аднаўленне і ахова прыроды ў цэлым. Трэба было закрыць многія «белыя плямы» на тэрыторыі Беларусі ў галіне геаграфіі, якія засталіся ў спадчыну ад царскай Расіі.

Гэта работа, у асноўным, праводзіцца сіламі вучоных Беларускага дзяржаўнага універсітэта, а таксама Акадэміі навук БССР.

Геаграфічныя даследаванні развіваюцца ў самых шырокіх маштабах, па ўсіх напрамках геаграфічнай навукі. Значныя работы праводзяцца ў галіне геамарфалогіі — навуцы аб будове паверхні, тыпах і формах рэльефу. У выніку на тэрыторыі Беларусі яшчэ да пачатку другой сусветнай вайны В. Дзяменцьевым былі выдзелены асноўныя геамарфалагічныя раёны, працягнуты даследаванні Беларускага Палесся. Прычым вялікая заслуга ў апошнім належыць вядомаму савецкаму вучонаму Б. Лічкову.

На падставе метэаралагічных назіранняў, праводзімых у Беларусі з пачатку XIX стагоддзя, працягвалася вывучэнне кліматычных асаблівасцей рэспублікі, ходу кліматычных элементаў, пор году, расшыралася сетка метэаралагічных станцый, пачалося вывучэнне заходніх, уз'яднаных абласцей.

Гэта плённая работа была перапынена вераломным нападам фашысцкай Германіі на Савецкі Саюз у чэрвені 1941 года. Геаграфічныя даследаванні поўнасцю аднавіліся пасля заканчэння вайны. У іх, акрамя географаў універсітэта і Акадэміі навук БССР, прынялі ўдзел вучоныя педінстытутаў, асабліва Магілёўскага, Брэсцкага і Мінскага. Шырока разгарнулася падрыхтоўка высокакваліфікаваных кадраў. Па-ранейшаму асноўныя геаграфічныя сілы канцэнтраваліся ў БДУ на геаграфічным факультэце, які налічвае цяпер сем кафедраў, дзве навукова-даследчыя лабараторыі, геалагічны музей, кіналекторый, базу на рацэ Бярэзіна для вучэбнай практыкі. Факультэт і кафедры ўзначальваюцца віднымі беларускімі вучонымі, дактарамі, прафесарамі Н. Раманоўскім, В. Якушка, А. Шклярам, членам-карэспандэнтам АН БССР А. Мядзведзевым і іншымі. На факультэце—на дзённым, вячэрнім і завочным аддзяленнях — вучыцца цяпер каля 1 400 студэнтаў. Яны пасля заканчэння вучобы накіроўваюцца ў навуковыя ўстановы, праектныя інстытуты, школы, папаўняюць кафедры і навукова-даследчыя лабараторыі факультэта.

Пасля вайны, у выніку паглыбленых даследаванняў, у нас з'явіліся буйныя манаграфіі, прысвечаныя геамарфалогіі і раяніраванню рэспублікі: «Прырода Беларусі» (В. Дзяменцьеў, А. Шкляр, В. Якушка і інш.), работы па геахіміі (К. Лукашоў), возеразнаўству (В. Якушка), эканамічнай геаграфіі (Н. Раманоўскі, І. Трухан і інш.), геаграфіі глеб (А. Мядзведзеў), агульнай тапаніміцы і тапаніміцы БССР (В. Жучкевіч), выйшаў першы ў Савецкім Саюзе рэспубліканскі комплексны геаграфічны атлас, пачаліся ландшафтныя даследаванні на біягеацэнатычнай аснове (Цэнтральны батанічны сад АН БССР) і інш. Шэраг манаграфій па клімату Беларусі апублікаваны А. Шклярам.

Умацаваліся сувязі з іншымі факультэтамі і навуковымі ўстановамі Савецкага Саюза. Шырока практыкуецца абмен вопытам. У апошнія гады на геаграфічным факультэце Беларускага універсітэта з лекцыямі выступалі вядучыя вучоныя Масквы і Ленінграда — К. Маркаў, Ю. Саушкін, Э. Мурзаеў, Н. Гваздзецкі, В. Пакшышэўскі, А. Хрушчаў і інш. Гэтыя імёны вядомы географам, а таксама грамадскасці ўсяго свету. Вучоныя нашага універсітэта выступалі ў Ерэванскім, Грозненскім (Чэчэна-Інгушскім) універсітэтах, педагагічных інстытутах Беларусі.

Плённая работа вядзецца на тэлебачанні і радыё. Так, ужо сёмы год з удзелам выкладчыкаў геаграфічнага факультэта вядзецца праграма па геаграфіі для школьнікаў («Тэлебачанне — школе»), чацвёрты год — штомесячны часопіс «Прырода і мы», які рыхтуе таксама адзін з супрацоўнікаў факультэта.

Новыя вялікія задачы паўстаюць перад географамі рэспублікі ў новай пяцігодцы па яшчэ больш рацыянальнаму і разумнаму выкарыстанню прыродных рэсурсаў і ахове навакольнага асяроддзя ў самых шырокіх аспектах.

Вучоныя Беларусі прымаюць актыўны ўдзел у навуковым жыцці ўсёй нашай краіны. У сувязі з гэтым трэба адзначыць работы акадэміка І. Лупіновіча па комплекснаму фізіка-геаграфічнаму раяніраванню Савецкага Саюза, праведзенаму хутка пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны, палеагеаграфічныя работы акадэміка Г. Гарэцкага, апублікаваныя ў апошнія гады, удзел беларускіх вучоных у рабоце Навукова-метадычнага савета Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і інш. Беларускія географы здаўна падтрымліваюць дзелавыя навуковыя сувязі з географамі раду зарубежных краін. Асабліва паспяхова яны развіваюцца ў пасляваенныя гады. Зарубежныя сувязі ўключаюць кантакты па абмену вопытам, аказанне дапамогі ў арганізацыі і правядзенні экспедыцый, складанні карт, пастаноўцы вучэбнай работы і чытанні лекцый, выданні сумесных прац, а таксама па абмену студэнтамі, аспірантамі і стажорамі.

У адпаведнасці з гэтым, у 1955 — 1956 гг., напрыклад, была ажыццёўлена гадавая камандзіроўка ў КНДР загадчыка кафедры фізічнай геаграфіі БДУ імя У. І. Леніна, прафесара В. Дзяменцьева. У яго задачу ўваходзіла аказанне дапамогі геаграфічнаму факультэту Пхеньянскага універсітэта ў пастаноўцы чытання курсаў па фізічнай геаграфіі, правядзенні навукова-даследчых работ выкладчыкамі і аспірантамі гэтага факультэта, арганізацыі і правядзенні вучэбных і вытворчых практык студэнтаў у адпаведнасці з перадавой методыкай савецкай геаграфічнай школы.

Узмацненне і расшырэнне зарубежных сувязей географаў БДУ назіраецца пасля стварэння тут у 1961 годзе другой у Савецкім Саюзе, пасля маскоўскай, кафедры фізічнай геаграфіі зарубежных краін. Затым у 1968 годзе ствараецца кафедра эканамічнай геаграфіі зарубежных краін, што яшчэ больш садзейнічае ўмацаванню гэтых сувязей.

У 1963 годзе па запрашэнню Дзяржаўнага камітэта навук Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам у Ханой у якасці навуковага кансультанта накіроўваецца загадчык кафедры фізічнай геаграфіі зарубежных краін — аўтар гэтых радкоў. На працягу года пры маёй дапамозе, а таксама кансультанта прафесара Э. Мурзаева, крыху пазней прыбыўшага ў В'етнам, група маладых в'етнамскіх географаў на чале з прафесарам Нгуен Дык Цінь праводзіць на тэрыторыі ДРВ звыш 10 экспедыцый, якія праходзяць у цяжкіх, пераважна горных умовах.

У выніку былі складзены карты каля 40 назваў і праект комплекснага прыроднага раяніравання гэтай цікавай краіны. На тэрыторыі рэспублікі было выдзелена 6 прыродных абласцей, 50 раёнаў і 51 падраён. Гэта работа была апублікавана ў 1967 годзе у Паведамленнях Акадэміі навук СССР, у 1970 годзе ў Нью-Йорку ў часопісе «Soviet geography», у 1970 жа годзе выйшла манаграфія «Фізічная геаграфія Паўночнага В'етнама» на в'етнамскай мове ў Ханоі. У час нашага знаходжання ў В'етнаме, у перапынках паміж экспедыцыямі, мы чыталі лекцыі ў Ханойскім педагагічным інстытуце, вялі кансультацыі, а ў розных навуковых выданнях апублікавана 6 нашых артыкулаў па тэорыі фізічнай геаграфіі і раяніраванню.

У 1966 годзе па запрашэнню Польскага геаграфічнага таварыства на сімпозіуме сацыялістычных краін па фізіка-геаграфічнаму раяніраванню Польшчы з дакладам аб прыродным раяніраванні Беларусі выступіў В. Дзяменцьеў, які прымаў удзел у экскурсіі па рэспубліцы. У Алжыры па разведцы карысных выкапняў і складанні геалагічных карт працаваў прафесар з БДУ С. Бачурын. У рабоце XIX Міжнароднага кангрэса географаў, які праходзіў у Швецыі і ўключаў рад маршрутаў па Скандынавіі, прымаў удзел І. Трухан.

З 1967 года географы Беларусі ў парадку абмену пабывалі ў суседніх сацыялістычных краінах — у Балгарыі, Венгрыі, Польшчы, Югаславіі, прымалі ў сябе вучоных гэтых краін, а таксама прадстаўнікоў ГДР, Францыі і інш. Так, у Люблянскім універсітэце на геаграфічным аддзяленні, у Інстытуце геаграфіі АН Славеніі з дакладамі выступалі А. Малышаў і В. Заўрыеў, якія прайшлі некалькі маршрутаў па плато Карст, у Юлійскіх Альпах, на ўзбярэжжы Міжземнага мора.

Венгрыю, Будапешцкі універсітэт наведвалі Н. Раманоўскі, В. Заўрыеў з групай студэнтаў старэйшых курсаў Беларускага універсітэта. Яны правялі навукова-азнаямленчую практыку ў асноўным па заходніх раёнах Венгрыі. Аналагічную паездку са студэнтамі ажыццявілі супрацоўнікі нашага факультэта М. Лаўрыновіч і Ф. Фешчанка, якія наладзілі там добрыя і карысныя сувязі.

З 1967 года і да цяперашняга часу ажыццяўляліся неаднаразовыя навуковыя камандзіроўкі ў Сафійскі універсітэт А. Малышава, В. Заўрыева, Г. Кузьміной, В. Калечыца, В. Сіняковай, студэнтаў. У Сафіі чыталі лекцыі па сучасных праблемах фізічнай геаграфіі, па фізічнай геаграфіі Азіі, праводзілася практыка савецкіх студэнтаў. У сваю чаргу балгарскія і іншыя вучоныя і студэнты працавалі ў нашай краіне, напрыклад, Ілья Іванаў Хрыстаў і Мілан Георгіеў з Балгарыі, Секей Андраш з Венгрыі, К. Вянцкоўскі з Польшчы. Р. Шмітлен з Францыі, які працуе ў галіне тапанімікі, меў карысныя кантакты з В. Жучкевічам.

Асабліва трэба адзначыць сістэматычны ўдзел беларускіх вучоных-географаў у канферэнцыях ЮНЕСКО (ААН), прысвечаных адной з важнейшых праблем сучаснасці — «Чалавек і прырода», якія праходзілі ў апошнія гады ў Жэневе і Парыжы. Прадстаўніком Беларусі ў ЮНЕСКО з'яўляецца прафесар А. Малышаў, прарэктар БДУ імя У. І. Леніна.

Працягваючы паведамленне аб сумесных выданнях, нам хочацца яшчэ ўпамянуць нарыс «Беларусь», выдадзены ў 1969 годзе ў Сафіі, артыкул балгарына П. Пятрова аб ландшафтах гары Славянкі, апублікаваны ў Весніку БДУ у 1973 годзе, нашу брашуру «Индия» (1975 год), выдадзеную таварыствам «Веды» ў Мінску, артыкулы ў Весніку БДУ, прысвечаныя Польшчы, ГДР, Бразіліі, Ірландыі і інш.

Беларускія географы рэгулярна робяць азнаямленчыя паездкі па розных краінах і кантынентах. Толькі за апошнія 10 гадоў яны наведалі больш чым 30 краін, у тым ліку Балгарыю, Венгрыю, Румынію, Югаславію, ГДР, Польшчу, Аўстрыю, Італію, Фінляндыю, Францыю, Кітай, Індыю, АРЕ, Танзанію, Маўрыкій, Мадагаскар, Кубу, Мексіку і інш.

Гэтыя паездкі дапамагаюць нам у рабоце, даюць непасрэдныя ўражанні аб краінах і народах, якія насяляюць нашу планету. На жаль, пра нас, наша жыццё, нашы дасягненні і поспехі яшчэ мала ведаюць у зарубежных капіталістычных краінах або маюць там далёкія ад рэчаіснасці ўяўленні, чаму садзейнічае неаб'ектыўная інфармацыя пра нас. Успамінаецца, як адзін географ у Італіі спытаў, адкуль я. На мой адказ, што я прыехаў з Беларусі, ён заўважыў, што гэта «недзе на Паўночным Каўказе».

Міжнародныя сувязі служаць умацаванню дружбы паміж народамі, даюць магчымасць расказваць аб дасягненнях Савецкага Саюза і нашай Беларусі за рубяжом, садзейнічаюць інтэрнацыянальнаму выхаванню моладзі, узбагачаюць і расшыраюць нашы геаграфічныя веды.

Зарубежныя і айчынныя выданні, у якіх змешчаны працы беларускіх географаў.

КАМАНДЗІРОЎКА «ЛЮБЛІН–БРЭСТ»

Нядаўна адбылася прэм'ера вядомай оперы С. Манюшкі «Галька» на беларускай опернай сцэне. Спектакль цікавы тым, што ў ім аб'ядналіся творчыя намаганні музычнага кіраўніка Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР Я. Вашчака і рэжысёра з Польскай Народнай Рэспублікі Б. Янкоўскага. Летась была творчая сустрэча галоўнага рэжысёра Брэсцкага драматычнага тэатра імя Ленінскага камсамола Беларусі, народнага артыста БССР Г. Волкава з артыстычным калектывам тэатра імя Ю. Астэрвы з горада Любліна. Ён паставіў п'есу рускага класіка І. Тургенева «Месяц у вёсцы». На пачатку сёлетняга года ў Брэсце цёпла віталі госця з ПНР: сюды прыехаў рэжысёр ваяводскага тэатра ў Любліне Юзэф Ясельскі. У парадку творчага абмену ён падрыхтуе з артыстамі тэатра спектакль па п'есе сучаснага польскага драматурга К. Хаіньскага «Начная аповесць». Рэпетыцыі пачаліся.
НА ЗДЫМКУ: Юзэф Ясельскі сярод акцёраў Брэсцкага тэатра.

ПРЫСВЯЦІ СЯБЕ БУДУЧЫНІ

Цяпер у нас у Беларусі сфарміравалася новая плеяда пісьменнікаў. Гэта маладыя паэты, празаікі і крытыкі, равеснікі Перамогі і тыя, хто нарадзіўся пасля яе. Атрад гэты даволі вялікі. У паэзіі на поўны голас аб сабе заявілі В. Іпатава, Р. Семашкевіч, А. Разанаў, Ю. Голуб, Я. Янішчыц, А. Камароўскі, Г. Пашкоў, у прозе — А. Жук, В. Гігевіч, у крытыцы — Я. Ляцко, С. Лаўшук, А. Марціновіч...

Многія з іх былі ўдзельнікамі V і VI Усесаюзных нарад маладых літаратараў. Вядомыя пісьменнікі, строгія і добразычлівыя, далі прынцыповую ацэнку іх творчасці.

Цяпер сярод нас, маладых, бадай, найбольш актыўныя паэты.

У іх вершах—роздум аб рэвалюцыйных традыцыях пакаленняў, аб подзвігу народа ў гады барацьбы за свабоду і незалежнасць, сённяшніх працоўных буднях, аб свеце пачуццяў нашага сучасніка. Я маю на ўвазе такія творы, як «Арышт Кастуся Каліноўскага» А. Разанава, «Спадчына» Г. Пашкова, «Магіла лётчыкаў» Р. Семашкевіча.

Можна смела сцвярджаць, што сфарміраваліся яркія індывідуальнасці. Аналітычны, з філасофскім роздумам над жыццёвымі з'явамі паэт А. Разанаў і эмацыянальны, з высокай паэтычнай культурай, гнуткай структурай вершаваных радкоў Ю. Голуб, зоркі да душэўных рухаў чалавека, майстар прыгожага слова А. Жук. Іх вершы, проза ўносяць свежы струмень у рэчышча нашай літаратуры.

Праўда, гаворачы аб маладых празаіках, хочацца пажадаць ім большай актыўнасці. У іх багажы пакуль толькі некалькі ўдалых апавяданняў аб вайне і яе выніках—«Белы месяц», «За дзедавым лесам», «Жонка героя», аповесць «Чыгун», напісаныя А. Жуком. З твораў, прысвечаных нашым дням, сучаснікам—рабочым, калгаснікам, інтэлігенцыі, трэба адзначыць апавяданні таго ж А. Жука, В. Гігевіча, а таксама паспяхова дэбютаваўшых у мінулым годзе А. Дударава і М. Вараву. Гэты скупы пералік імён і твораў гаворыць аб тым, што маладым беларускім празаікам трэба не толькі расці колькасна, але і якасна—набываць жыццёвы і літаратурны вопыт.

Размова аб творчасці, у тым ліку і аб творчасці маладых, як правіла, вядзецца ў першую чаргу з пункту гледжання якасці літаратурнай працы. Гэта вельмі правільна, таму што сапраўдная літаратура заўсёды гэтым вызначалася, таму і цяпер з асаблівай сілай слова «якасць» у нас уведзена ў паўсядзённы ўжытак. Яно стала дэвізам дзесятай пяцігодкі. Натуральна, што ад нас, пісьменнікаў, патрабаванне дабротнасці нашай працы асобае. Добра, дарэчы, сказаў аб гэтым нядаўна Міхаіл Рошчын у «Комсомольской правде»: «Чытач разумны, сур'ёзны, вельмі заняты справай, таксама чакае ад нас справы. Нездарма лозунгам дня становіцца якасць—дык каму ж, як не літаратарам, узнімаць яе на шчыт? Няякаснай літаратуры не бывае, у адваротным выпадку яна і не называецца літаратурай».

Праўда, крытыкі сцвярджаюць, што маладыя літаратары, якія выпусцілі па адной, а хто і па дзве кнігі, сталі членамі Саюза пісьменнікаў, яшчэ не стварылі яркіх твораў «аб часе і аб сабе», аб сваіх равесніках, якія ўжо рушылі наперад навуку, мастацтва, плячо ў плячо са старэйшымі ўдзельнічаюць у будаўніцтве камунізму. Але разам з тым, на мой погляд, асобныя нашы крытыкі цяпер дапускаюць у ацэнцы творчасці маладых і некаторыя крайнасці.

Сёння наша беларуская літаратура знаходзіцца на высокай ступені развіцця, а шматлікія яе таленты—М. Танк, П. Панчанка, І. Мележ, Я. Брыль, В. Быкаў, М. Лобан, А. Кулакоўскі, многія з пакалення І. Пташнікава і Р. Барадуліна—у самым росквіце творчых сіл. І сёння менавіта яны нясуць галоўную службу ў літаратуры. Чаму вучыць нас гэты мудры аванпост? Па-мойму, у першую чаргу, творчай мужнасці. Смеласці перш за ўсё «замахнуцца» на такую працу, якая была б на ўзроўні класічных твораў—рамана «Людзі на балоце», аповесцей «Трэцяя ракета», «Тартак», апавяданняў Я. Брыля... І нам, маладым, ёсць аб чым пісаць, ёсць што сказаць аб пасляваенным перыядзе, калі працякала наша нялёгкае дзяцінства ў пяцідзесятых і шасцідзесятых гадах, калі праходзіла наша юнацтва, уражанае «інтэлектуальнай бурай» і выхаванае гэтай бурай. Нарэшце, на нашых вачах ажыццяўляецца магутны поступ навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, сацыялістычных ідэй, розуму і культуры.

Адна з галоўных задач маладых пісьменнікаў—стварыць паўнакроўны вобраз свайго равесніка, чалавека высокаадукаванага, выхаванага на гуманістычных традыцыях, аддадзенага справе бацькоў, справе будаўніцтва камунізму, бо чалавек заўсёды быў і будзе галоўным рухавіком прагрэсу, прадаўжальнікам жыцця на зямлі. У мяне, у прыватнасці, цяпер аб'ект творчых помыслаў—вёска і школа. У заходнебеларускай вёсцы я нарадзіўся, яе вачыма пачаў пазнаваць свет, бачыў яе сацыяльны, эканамічны і культурны рост, настаўніцтву было аддадзена мною пяць гадоў жыцця. Аб гэтым, найбольш мною перажытым, я і думаю цяпер, пішу і яшчэ шмат буду пісаць.

Г. ДАЛІДОВІЧ,
удзельнік VI Усесаюзнай нарады маладых літаратараў.

З ПАМЯЦІ НАРОДНАЙ

Творчая спадчына Ф. Багушэвіча, як вядома, не вычэрпваецца толькі паэтычнымі зборнікамі «Дудка беларуская» і «Смык беларускі» і трыма яго апавяданнямі. У паэта было шмат твораў у рукапісах, якія чакалі надрукавання, але так і не ўбачылі свету, бясследна загінулі,— часткова ў прыватных архівах сяброў, часткова ў кабінетах цэнзараў.

Настойлівыя пошукі Багушэвічавай шкатулкі з рукапісамі не далі пакуль пэўных вынікаў. Тым не менш, надзея і жаданне адшукаць хоць якія сляды невядомых Багушэвічавых твораў не згасла ў прыхільнікаў таленту паэта. А што гэткія творы былі, сведчаць і дакументы, і многія сучаснікі песняра. Некаторыя нават згадваюць іх назвы. Так, напрыклад, Гэля Каспяравічанка, па мужу Горыт, блізкая суседка паэта па Кушлянскім двары, называе сярод іншых твораў, якія яна чула ад яго, і вершы «Шаршуны ўлетку, Шаршуны ўзімку», «Вясковая баба», «Ой, калючы ялавец, ягадкі салодкія».

Што гэта былі за творы, цяжка сказаць. Адно зразумела, тэматыка іх узята з сялянскага жыцця і побыту.

Між іншым, сучаснікі паэта згадваюць, што Ф. Багушэвіч мог і любіў складаць вершы «на ходу», экспромтам. «Бывала, зойдзе да каго ў хату, нагаворыць, нагаворыць, накрытыкуе», — апавядала Аміля Цюлькевіч, сялянка з вёскі Гудзяняты, якой у канцы 90-х гадоў давялося жыць у Кушлянах і даглядаць хворага паэта. Часцей за ўсё гэта былі вершаваныя жарты, эпіграмы, сатырычныя чатырох- і двухрадкоўі.

Многія кушлянцы і жыхары іншых навакольных вёсак да гэтага часу памятаюць змест вершаў, чутых іх бацькамі і дзядамі ад Багушэвіча. Некаторыя з іх яны расказваюць з пэўным захаваннем рыфмаў і рытму.

«А што калі, — падумалася аднойчы,— паспрабаваць пашукаць вершы Багушэвіча ў памяці народнай. Прычым, такія, якія нідзе раней не друкаваліся, а толькі распаўсюджваліся ў рукапісах, у вусных пераказах».

Было зразумела, шлях пошукаў не вельмі надзейны. Гэтулькі мінула часу! І ўсё ж нам удалося адшукаць адзін з жаданых вершаў, які былыя кушлянцы аднагалосна называюць Багушэвічавым.

Вось гэты твор:

ПАН І БЛЫХА

Улезла блыха пану ў пярнат,
Пан з яе ня быў рад,
Стала кусаць пана за брушка,
Тлуста-мякка, як падушка,
Пасмакуе пану кроў,
Паскача — і смок ізноў.
Пан на бакі варухаўся,
Як цюцька скрабаўся.
Нарэшце, блыху злавіўшы, адазваўся:
«Ты, праклятае насенне,
Не досць табе, што жывеш без працы,
Яшчэ захацела жыць у палацы!»
І так, мармычучы пад нос,
Блыху да свечкі ён паднёс.
«Стой!—закрычала блыха тут,—
Праўда дзе ж!
Я п'ю з цябе аднаго кроў,
А ты з тысячы людзей п'еш!»

Няма сумнення, верш напісаны ў Багушэвічавым стылі; ён не выбіваецца і з Багушэвічавай тэматыкі. Збіральны вобраз пана як найвялікшага крывасмока таксама характэрны для ўсёй творчасці Ф. Багушэвіча. У сатырычным вершы «Пан і Блыха» страчаюцца і звыклыя для Багушэвіча паэтычныя сродкі «брушка, тлуста-мякка, як падушка». Параўнаем: «рукі... як падушкі, як кісель, дрыжыць жывот» (верш «Бог не роўна дзеле»).

Вельмі характэрны для творчай манеры Багушэвіча ў вершы «Пан і Блыха» і дыялог. Ён амаль такі, як і ў байках «Свіння і жалуды», «Воўк і авечка»,— лаканічны, выразны.

Па-багушэвіцку афарыстычная і канцоўка твора: «Я п'ю з цябе аднаго кроў, — кажа Блыха Пану, — а ты з тысячы людзей п'еш!» Гэтак трапна, думаецца, мог сказаць толькі Ф. Багушэвіч, які ўсёй сваёй істотай ненавідзеў панскі паразітызм.

Сатырычны верш «Пан і Блыха» перадалі нам па памяці жыхары Польскай Народнай Рэспублікі (з Вольштына Познаньскага ваяводства) Зыгмунт і Восіп Каспяровічы, сыны старога Пятра Каспяровіча, былога Багушэвічавага суседа па Кушлянах. «Верш гэты, — сказаў Зыгмунт у гутарцы з хавальнікам сядзібы Ф. Багушэвіча Міхалам Ляпехам,— я ведаю з маленства, ад бацькі, і бацька мне казаў, што напісаў яго Мацей Бурачок — Францішак Багушэвіч».

І ў нас няма падстаў сумнявацца ў гэтым, тым больш, што твор адпавядае духу творчасці песняра з Кушлянскага краю.

Уладзімір СОДАЛЬ.

Фальклорны самадзейны ансамбль вёсак Праскурні і Затон на Жлобіншчыне.
Фота Я. БРЫЛЯ.

ВЫСТАЎКА ЛЯСНОЙ СКУЛЬПТУРЫ

Шэсць гадоў займаецца лясной скульптурай выкладчык Полацкай дзіцячай спартыўнай школы Юрый Халадноў. Яго работы ўжо заваявалі прызнанне: на віцебскай абласной выстаўцы Халадноў быў узнагароджаны дыпломам першай ступені. Некаторыя з яго работ дэманстраваліся ў Вільнюсе на міжрэспубліканскай выстаўцы. Скульптура «У засадзе» пабывала на выстаўцы ў ГДР.

Нядаўна ў Полацкім гарадскім доме культуры адкрылася персанальная выстаўка мастака-аматара, на якой экспануецца 75 работ — скульптур з карэнняў дрэў. У карэннях сасны, вольхі і рабіны, чаромхі, арэшніку ён угадвае вобразы вядомых нам казак, вобразы з легенд і былін. Некалькі ўмелых дотыкаў разца, і з заблытаных перапляценняў дзіўнага кораня ствараецца скульптура.

Сонейка з гліны



Для некаторых звычайная гліна— проста гразь пад нагамі. Малады беларускі мастак-кераміст Аляксандр Зіменка бачыць у ёй універсальны сродак зносін паміж людзьмі. Пра яе можна многае расказаць.

Так было спрадвеку —вырабамі вясковага ганчара, пераважна посудам, карысталіся цэлыя сем'і. Цяпер людзей усё больш прыцягвае мастацкі бок традыцыйных рэчаў, матэрыялаў. І гліна са сваёй пластычнасцю зноў сціпла выходзіць на пярэдні план.

Аляксандр нарадзіўся ў 1946 годзе ў Мінску. Горад, разбураны вайной, адбудоўваўся ў яго на вачах і, мабыць, сённяшні ўдзел маладога мастака ў афармленні гарадскога інтэр'ера можна разглядаць як жаданне зрабіць свой уклад у агульную справу.

Яго мастацкая індывідуальнасць (А. Зіменка закончыў у 1970 годзе Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут па аддзяленню мастацкай керамікі і шкла) праявілася яшчэ ў час вучобы. З 1966 года ён імкнецца актыўна ўдзельнічаць у выстаўках. Мінск, Масква, Рыга, Ленінград, Вільнюс... Апошняя— «Кераміка СССР-2» праходзіла ў Вільнюскім палацы выставак летам 1975 года. Тут мастак прадставіў набор гратэскавых фігур «Злыя каралі». Выдатнае адчуванне матэрыялу, вастрыня псіхалагічных характарыстык, прынцыповасць пазіцыі мастака прыцягнулі да работы заслужаную ўвагу гледачоў.

Аляксандра Зіменку як мастака вызначаюць на дзіва беражлівыя і чулыя адносіны да мінулага свайго народа, метафарызм мыслення, дакладны разлік функцый інтэр'ера і схільнасць да гумару, які пераходзіць часам у гратэск. Усё гэта праявілася ўжо ў першым яго самастойным афармленні памяшкання Беларускага аддзялення Агенцтва друку Навіны, што стала адначасова дыпломнай работай.

У кожным канкрэтным выпадку мастак знаходзіць рашэнне, што адпавядае менавіта данаму інтэр'еру. Калі ў Агенцтве друку Навіны мастак стварае своеасаблівы гімн літары, дзе, як у калейдаскопе, змяшаліся і зліліся і старажытная друкаваная літара беларускага першадрукара Георгія Скарыны, і інфармацыя на вагах, і парадаксальны гадзіннік, дзе замест лічбаў літары, і два абліччы: перамога сонца — ведаў над цемрай — невуцтвам, то ў інтэр'еры інтэрната ветэранаў партыі і працы створана атмасфера спакою, сагрэтая цёплым гумарам пастаўленых каля камінаў фігур «хавальнікаў паверхаў».

А распрацоўка інтэр'ераў рэстарана «Заслаўе» адкрыла новыя здольнасці Аляксандра Зіменкі. Ім спраектаваны і распрацаваны свяцільнікі, чаканка, зварныя рашоткі, флюгеры і, як заўсёды, на самым высокім узроўні выканана кераміка. «Заслаўе» па праву можна лічыць адной з творчых удач мастака.

Такі арганічны сінтэз нацыянальных традыцый са здабыткамі сучаснай культуры, імкненне быць карысным людзям — вось шлях, па якім ідзе малады беларускі мастак Аляксандр Зіменка.

Ю. ВАСІЛЬЕЎ.

НА ЗДЫМКАХ: інтэр'ер Беларускага аддзялення Агенцтва друку Навіны; «Каваль Вярнідуб»; «Антычная алегорыя».

Рыбакі. **Фота А. ГЛІНСКАГА.**

БЕЛАРУСКІЯ РАТУШЫ

У беларускай архітэктурнай спадчыне феадальных часоў адно з вядучых месц займаюць ратушы — манументальныя пабудовы, якія ўзводзіліся ў цэнтрах гарадоў і мястэчак на галоўных гандлёвых плошчах і былі месцам знаходжання органаў гарадскога самакіравання (рады, магістрата). Дзякуючы свайму прызначэнню і ролі ў эканамічным і грамадска - палітычным жыцці пасяленняў, ратушы былі аднымі з буйнейшых грамадскіх пабудоў сярэднявечча і, разам з замкамі і гандлёвымі радамі, актыўна ўдзельнічалі ў фарміраванні архітэктурна - мастацкага аблічча цэнтраў беларускіх гарадоў і мястэчак.

Гісторыя з'яўлення ратуш на Беларусі непасрэдна звязана з распаўсюджаннем так званага «Магдэбургскага права», якое рэгулявала і вызначала арганізацыю рамеснай вытворчасці, гандлю, парадак выбрання і дзейнасць гарадскога самакіравання, цэхавых аб'яднанняў рамеснікаў і купцоў. Яно ўзнікла ў XIII стагоддзі ў Магдэбурзе (Усходняя Германія) і з XIV стагоддзя пранікла на Беларусь. Згодна з ім, жыхары гарадоў і мястэчак вызваляліся ад феадальных павіннасцей і залежнасці ад дзяржаўнай адміністрацыі і буйных магнатаў, а ў прыватна-ўласніцкіх пасяленнях гэтае права змяншала ўладу феадала над жыхарамі. Такім чынам, «Магдэбургскае права» стымулявала развіццё гарадскіх пасяленняў і рамеснай вытворчасці ў іх, пазбаўляла насельніцтва жорсткай прыгоннай залежнасці ад феадалаў.

Першым атрымаў права на самакіраванне ў 1390 годзе Брэст, а на працягу XV —XVII стагоддзяў яго дамагліся звыш 50 гарадоў і мястэчак. Самакіраваннем карысталіся не толькі такія буйныя гарады як Брэст, Гродна, Слуцк, Полацк, Віцебск, Мінск, Магілёў, Слонім, Пінск, Мазыр, Орша, Навагрудак, але і адносна невялікія пасяленні: Высокае, Радашковічы, Ула, Гарадзец, Любча, Чавусы, Лагішын, Давыд - Гарадок і інш.

Функцыянальнае прызначэнне ратуш было вельмі разнастайным. Цэнтральнае месца займала вялікая парадная зала, дзе заключаліся ўрачыстыя акты, адбываліся пасяджэнні магістрата і суда, а часам наладжваліся тэатралізаваныя прадстаўленні. Частка памяшканняў адводзілася пад хлебныя крамы, склады тавараў, арсеналы. Тут жа знаходзіліся памяшканні канцылярыі, гарадской казны, архіва, дзе захоўваліся ўсе граматы і прывілеі горада, яго актавыя кнігі, прадпісанні і рашэнні рады, судовыя пастановы.

У кампазіцыі і мастацкім аздабленні пабудоў ужываліся найбольш дасканалыя прыёмы беларускага дойлідства. Галоўным кампазіцыйным элементам ратуш з'яўлялася высокая ярусная вежа ў цэнтры будынка, якая сімвалізавала самастойнасць і палітычную вольнасць горада. Першапачаткова вежа выконвала абаронную ролю, таму ратуша ўяўляла ў радзе выпадкаў непрыступную цытадэль. Такая функцыя ратушы тлумачыцца тым, што ў ёй знаходзіліся агульнагарадскія скарбы. Вежа, завершаная купалам і шпілем з гербам горада, служыла таксама ў якасці дазорнай вышкі. На ёй часта змяшчаліся гадзіннік і звон. Паступова вежа страчвае сваё абаронае прызначэнне, аднак традыцыйная кампазіцыя ратушы захоўваецца. У XVIII стагоддзі некаторыя ратушы будуюцца без веж, што тлумачыцца канчатковай стратай іх абаронных функцый.

Прыкладна з XVI — пачатку XVII стагоддзя ратуша часта аб'ядноўвалася з гандлёвымі радамі ў адзіны ансамбль, у якім яна займала цэнтральнае месца. Такіх ансамбляў у Беларусі налічвалася звыш 20. Іх фарміраванне заканамерна вынікала з той ролі, якую займала ратуша ў эканамічным жыцці горада.

На Беларусі будавалася шмат мураваных ратуш. Найбольш старажытная сярэдвядомых — ратуша ў Нясвіжы, узведзеная ў XVI стагоддзі і часткова перабудаваная ў XVII—XIX стагоддзях. Цікавым помнікам архітэктуры барока з'яўляецца ратуша ў Магілёве, збудаваная ў 1679—1681 гадах народнымі майстрамі Феськай і Ігнатам. На жаль, яна не захавалася да нашага часу, але вядомы чарцяжы і фатаграфіі гэтай пабудовы. Мураваныя ратушы вядомы таксама ў Чавусах — XVII — XVIII стагоддзі, Слоніме, Шарашове, Віцебску, Чачэрску, Мінску, Гродна — XVIII стагоддзе.

Вялікую цікавасць выклікаюць драўляныя ратушы, бо дрэва з'яўлялася найбольш распаўсюджаным будаўнічым матэрыялам беларускага народнага дойлідства. У драўляным будаўніцтве выявіліся найбольш яскравыя рысы беларускай нацыянальнай архітэктуры.

Адна з драўляных ратуш паказана на «чарцяжы» Віцебска 1664 года. Збудавана яна, верагодна, у канцы XVI — пачатку XVII стагоддзя, пасля атрымання горадам права на самакіраванне ў 1597 годзе. Гэтае збудаванне было вырашана ў традыцыйнай для беларускага народнага дойлідства ярусной кампазіцыі і нагадвала абаронныя вежы. Пабудова змяшчалася на гандлёвай плошчы, абнесенай па перыметры дамамі рамеснікаў і крамамі гандляроў.

Ратушы ўяўляюць унікальную і самабытную з'яву ў гісторыі нацыянальнага дойлідства. Яны адлюстроўваюць станаўленне і першапачатковую ступень развіцця многіх тыпаў грамадскіх пабудоў, як адміністрацыйных, так і культурна - асветных. Прагрэсіўныя рысы архітэктуры гэтых збудаванняў з'явіліся той гістарычнай глебай, на аснове якой склалася мноства тыпаў грамадскіх пабудоў нашага часу. Гэта— будынкі ўрадавых устаноў, дамы культуры, тэатры, архівы і многія іншыя.

Юрый ЯКІМОВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:

МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44. ТЭЛЕФОНЫ: 33-07-82, 33-02-80, 33-03-15, 33-01-97.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. 386.